# СКЛАСЬЦІ КНІГУ

…Складаць шмат кніг — канца ня будзе, і багата чытаць — стома для цела.

Эклезіяст

Як нястомны выдавец, рупны кніжнік, Уладзімір Сіўчыкаў ведае розьніцу паміж "складаньнем кніг" і складаньнем кнігі. Той адзінай, якая ня збор твораў, ня зборнік, не "Выбранае", не анталёгія, але гэта *твая* кніга, чытаць якую ня стомяцца ані твой брат, ані твой рэдактар, ані ты сам. Якую можна падараваць жонцы, брату, сябру або самому сабе ў дзень Анёла.

Тут давядзецца ахвяраваць, хочаш ня хочаш, асобнымі тэкстамі, прытым якаснымі. Асобнымі аповядамі, навэламі, раскіданымі ў пэрыёдыцы, зьмешчанымі ў зборніку "Гульня ў тэстамэнт", казкамі, п’есамі. Апроч жорсткай сэлекцыі мусіш шукаць тэкстам арыгінальную абалонку. І яна знаходзіцца — тры капэрты, у кожную зь якіх пісьменьнік зьмяшчае тры тэксты — тры "лісты" "Да брата".

Пэўна, ёсьць і брат, што атрымае лісты дзесь у Жодзіне або на ўскраіне Менску, у якімсьці гарадзкім "спальным" раёне. Але ўяўляецца перадусім рытарычны "брат", — братка-беларус, тутэйшы скептык, мясцовы Эклезіяст, які, шкадуючы брата-літаратара, паблажліва кажа: "Багата чытаць — стома для цела... Што было, тое й будзе, а што рабілася, тое й будзе рабіцца, ды няма нічога новага пад сонцам... Дый увогуле, усё марная мітусьня ды лоўля ветру, Валодзя..."

О, шчасьліўчык! Але ён мусіць расьпячатаць капэрты.

Першы позірк на тэксты сьведчыць, што яны складзеныя не філёлягам.

Мы звыкліся з тым, што бальшыня літаратурных кадраў у Беларусі гартуецца ў кузьні філфакаў — сталічных ды пэрыфэрыйных. Вэрбальная, філялягічная прырода іхніх тэкстаў відавочная. Ня так даўна выпускнікі іншай кузьні — мастацкай вучэльні імя Глебава — Глёбус, Сьцяпан — далі ўзор інакшай, візуальнай альбо эйдэтычнай прозы.

Проза Сіўчыкава, таксама гадаванца гэтай школы, адметная зрокавымі эфэктамі.

"Сьвятло лямпы лілося расплывістым конусам на бель старонак і на вінна-залацістую паліроўку стала. Абажур утвараў на цьмяна-бэзавай столі мяккі круг, а дакладней — паўкружжа. Другая частка кругу прыпадала на паверхню, паклееную вохрыстымі, у штрых цісьнёнымі шпалерамі. Шырокае, ледзь не на ўсю сьцяну вакно было зацягнутае бардовымі шторамі з атласнай тканіны. Праз шчыліну між імі было відаць, што на дварэ ідзе сьнег. Да шыбаў ляпіліся крышталікі ў выглядзе зорачак, шасьціграньнікаў і шасьцярэнькаў. Але яны хутка страчвалі сваю канфігурацыю, раставалі, аплывалі сьлязамі" ("Адліга").

Гэта ня проста звыклы "жывапіс словам", гэта погляд мастака, які ў думках разьмяшчае рэчаіснасьць на ўяўным палатне або пачынае зьмешваць фарбы на палітры.

Гэта ня значыць, што Ул. Сіўчыкаў не ўжывае ў сваёй прозе таго рэчыва, зь якога творыцца "звычайная" літаратура. У адрозьненьне ад іншых выхаванцаў глебаўскай вучэльні, якія тварылі "кубістычную", авангардысцкую прозу, Сіўчыкаў хутчэй — традыцыяналіст.

Фабульнасьць, назіраньне, псыхалягізм, нават дыдактыка, — яны прысутнічаюць у гэтай прозе. Але ў адметным візуальным атачэньні.

Даволі трывіяльная жыцьцёвая гісторыя, пераказаная ў "Адлізе" (драма мастака, апанаванага рэфлексіяй, няўдачамі, т. зв. "творчым крызысам") выбухае нечаканым аптычным эфэктам у манеры "оп-арту" або "новараманізму". Эфэкт "патройнага бачаньня" ўзьнікае, калі "я-герой" навэлы глядзіцца ў люстэрка-трыльяж.

"Патраеньне" — адна з улюбёных паэтычных фігур Сіўчыкава. "Траіснасьць" надае адмысловы калярыт аповесьці, створанай на хрэстаматыйную тэму першага каханьня — "Тры лілеі, лілеі тры..."

Крохкая, балесная душа падлетка з навэлы "Над вадаспадам" атаясамліваецца зь візуальным вобразам бягучай вады, у якім знаходзім і прыкметы зьменлівасьці, псыхалягічнай няўлоўнасьці, і намёк на суіцыд.

Псыхалягізм прозы Сіўчыкава — гэта перадусім малюнак, абраз або каляж, як у аповедзе "Экспрэс". Тэкст выглядае камбінацыяй газэтных выразак, фрагмэнтаў крымінальнай кронікі, пагалосак, плётак, містыфікацыяў і старэчай балбатні. Сіўчыкаў спасьціг цікавую акалічнасьць псыхалёгіі пажылога чалавека: бабулькі любяць "страшкі" нават больш за палітыку.

Дзевяць "лістоў" у трох капэртах, унутранае "патраеньне" вобразаў, стракатасьць і ўскладнёнасьць псыхалягічнага малюнку — і разам з тым строгая архітэктоніка кнігі. Можна ўявіць, як капэрты ўкладаюцца адна ў адну, утвараючы каштоўную бандэроль, якую аўтар дасылае... самому сабе. Так, бо ў "Трох лілеях..." праскочыла цікавае і, на жаль, трапнае псыхалягічнае назіраньне: "...Самы цікавы для кожнага з нас чалавек — гэта мы самі, нашае "я". ... На групавых фотаздымках адшукваеш найперш самога сябе, а ўжо потым — сяброў, знаёмых і каханак".

Каб усё было йнакш, мы ня мелі б ані сапраўднае лірыкі, ані інтэлектуальнае прозы, ані героя-інтэлігента, занятага рэфлексіяй, самааналізам, споведзьдзю.

Такім чынам, аўтар расьпячатвае, адну за адной, адрасаваныя сабе капэрты, углядваецца ва ўласнае аблічча й пазначае: гэта кола першае — Жодзіна, і я ў ім, местачковы падшпарак; гэта кола другое — у межах Менскай кальцавой шашы, і я ў ім; гэта я, разам з маёй любай радзінай у коле маіх вандровак — Абхазія, Нямеччына, Карфаген.

Самааналіз тут закранае ня толькі асобу аўтара, колькі беларускую душу, у тым яе балючым месцы, дзе душа зрастаецца зь целам Бацькаўшчыны. Гэты балючы ракурс бачаньня, параўнальна-настальгічны, быў уласьцівы ўсім беларускім літаратарам-вандроўнікам, якія аглядалі чужыну вачыма беларуса і Беларусь — здалёк, вачыма вандроўніка. Панчанку ("Іранскі дзёньнік"), Танку, Караткевічу ("Чазенія"), Арлову.

Гэты нябачны пункт, да якога скіраваны вэктар аўтарскае ўвагі, пункт судакрананьня аўтарскага ego і той субстанцыі, што адны завуць Бацькаўшчынай, другія — эстэтычным ідэалам, трэція — літаратурай, чацьвертыя — творчасьцю, пятыя — нічым, і ёсьць нябачным цэнтрам трох замкнёных колаў, да якіх зводзіцца архітэктоніка гэтае кнігі. Уласна кажучы, яно — і ёсьць тое непраказанае, дзеля чаго пішуцца ўсе кнігі ў сьвеце. Дзеля чаго мы мусім спрачацца з Эклезіястам, складаючы й складаючы кнігі.

***Пятро Васючэнка***